УСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
«Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей»

# КРАЯЗНАЎЧЫЯ ЗАПІСКІ

*Выпуск 10*

Гродна
«ЮрСаПрынт»
2016

Репозиторий БарГУ

УДК 908(476.6)(082)
ББК 63.3 ( 4 Бен)
К 78

*Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнай рады УК «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей»*

*Рэдакцыйная калегія:*
**Ю.В. Кітурка (галоўны рэдактар), К.В. Галота, А.А. Данілевіч, В.М. Царук.**

*Рэцэнзенты:*
**С.В. Марозава, доктар гістарычных навук, прафесар, Л.В. Калядзінскі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**

К78 **Краязнаўчыя** запіскі. Выпуск 10 / – Гродна : ЮрСаПрынт, 2016. – 180 с.

ISBN 978-985-7134-15-1.

У дзясятым выпуску зборніка "Краязнаўчыя запіскі" змешчаны артыкулы, у якіх разглядаюцца гісторыя забудовы, праблемы захавання, аднаўленчыя работы ў замках і сядзібах Гродзеншчыны. Матэрыялы кнігі адрасуюцца выкладчыкам ВНУ, настаўнікам, вучнёўскай і студэнцкай моладзі, а таксама краязнаўцам і аматарам гісторыі і культуры прынёманскага рэгіёна.

**УДК 908(476.6)(082)**
**ББК 63.3 ( 4 Бен)**

**ISBN 978-985-7134-15-1**

©УК «ГДГАМ», 2016

Репозиторий БарГУ

# ЗМЕСТ

**Ю.В. Кітурка**
Рэльеф Замкавай гары ў Гродне 3

**А.А. Хацько**
Цэгла замка Вітаўта з раскопак 2015 г. на Старым замку ў Гродне 13

**Я.Я. Лялевіч**
Нумізматычныя знаходкі на гродзенскім Старым замку ў 2015 годзе 19

**В.В. Бачков**
Алебастровый зал в Старом замке 23

**О.В. Шимбарецкий**
«Барбакан» Старого замка. Тезисы к докладу 29

**А.Ф. Вашкевіч**
Комплекс старых гродзенскіх могілак. Гісторыя, мастацкая каштоўнасць, перспектывы выкарыстання як аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны 40

**Я.А. Махнач**
Гродзенскія сінагогі і малітоўныя дамы ў XVIII – пач. XX ст. 52

**І.Р. Лапеха**
Вопыт рэканструкцыі яўрэйскага квартала ў Гродне 68

**С.А. Пивоварчик**
Неизвестная попытка реставрации Борисо-Глебской церкви в Гродно накануне Первой мировой войны 75

**И.Э. Мартыненко**
Правовые проблемы охраны исторического центра Гродно как архитектурного ансамбля 86

Репозиторий БарГУ

**Н.А. Пачобут**
Археалагічныя даследаванні двара Беразавец Кмітаў-Стратовічаў у 2014 г. ........ 98

**А.І. Шаланда**
Інвентар маёнтка Аляксандра Ягняткоўскага 1698 г. у фондах ГДГАМ ........ 115

**М.А. Загідуліна**
Класіцызм як архітэктурны напрамак творчасці Караля Падчашынскага ........ 125

**О.В. Новицкая**
Восстановительные работы в Мирском замке при князе Михаиле Святополк-Мирском в 1920–1930-е гг. ........ 142

**У.М. Зуеў**
Сучасны стан сядзібна-паркавых комплексаў Баранавіцкага раёна і перспектывы іх выкарыстання ........ 151

**О.В. Колосовская**
История имения Обрина и предложения по возрождению усадебной застройки с восстановлением функций зданий, входящих в её состав ........ 160

**Ю.С. Безносик**
Имение Турец как одно из владений Ходкевичей ........ 172

Репозиторий БарГУ

728.83(476.7)

**У.М. Зуеў**
*г. Баранавічы*

# Сучасны стан сядзібна-паркавых комплексаў Баранавіцкага раёна і перспектывы іх выкарыстання

Значэнне сядзібных паркаў разнастайнае. Парк каля сядзібы неабходны быў, на думку даследчыкаў, для стварэння ветраахоўнага экрана. Паркавыя насаджэнні выконвалі ландшафтна-эдыфікатарную функцыю. Яны стабілізавалі лакальны кліматычны рэжым, падтрымлівалі раўнавагу экасістэм. Сядзібныя паркі былі асабліва неабходныя на бязлесных прасторах.

Даследаванні, якія прысвечаны сядзібна-паркавым комплексам Беларусі наогул і Баранавіцкага раёна ў прыватнасці, немшатлікія. Можна назваць такіх даследчыкаў як В. Анціпаў [1], М. Бернат [2], В. Дубейка [2], Л. Несцярчук [3; 4], Р. Афтаназы [5] і інш. Біяразнастайнасці паркавых комплексаў прысвечаны работы Д.С. Лундышава [6], С.К. Рындзевіча [7; 8] і інш.

Самым значным даследаваннем гісторыка-культурнага напрамку можна назваць працу А. Федарука, якая прысвечана сядзібам Брэсцкай вобласці [9]. Але тут, на жаль, адсутнічаюць карты-схемы некаторых паркаў, або інфармацыя на іх састарэлая і не адпавядае сучаснаму стану, практычна не апісана флора паркавых экасістэм.

Асобна можна вылучыць як крыніцу інфармацыі дакументацыю на наданне статусу помніка прыроды паркам у Крошыне (1976), Вольна (1994), Верхнім Чэрніхаве (1994), Туганавічах (1994), Ястрамбелі (1994).

Вывучэнне сядзібна-паркавых комплексаў звязана з іх гістарычным значэннем, паколькі кожны парк, як і сядзіба, выступае адлюстраваннем тых гістарычных эпох, у якія яны ствараліся, і менталітэта шляхты, якая ўспрымала паркавыя насаджэнні як асяроддзе свайго жыцця і дзейнасці.



Репозиторий БарГУ

Паркі ствараліся з мясцовых і экзатычных дрэў і кустоў і былі своеасаблівымі гадавальнікамі розных відаў раслін. Значнай з'яўляецца роля паркаў як тэрыторый з унікальнай біяразнастайнасцю. Улічваючы ўсё пералічанае, можна сцвярджаць, што паркавыя ансамблі могуць быць асновай турыстычна-экскурсійных маршрутаў рознай тэматычнай накіраванасці – ад гісторыка-краязнаўчай да экалагічнай (і прыклады такія ёсць!) [10].

У нашым даследаванні прыводзяцца дадзеныя па выніках маніторынгу паркавых комплексаў у Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці.

На думку Л. Несцярчука, у пачатку XX ст. на тэрыторыі раёна налічвалася 192 сядзібна-паркавыя і палацава-паркавыя ансамблі [3; 4]. Але ж праведзены намі аналіз літаратурных і картаграфічных крыніц паказаў наяўнасць толькі 30 паркаў або іх элементаў. Магчыма, даследчык палічыў шляхецкія сядзібы, якія не заўсёды мелі ў сваёй структуры парк як ландшафтна-кампазіцыйны элемент.

Палявыя даследаванні паказалі, што паркавыя ансамблі ў Гарадзішчы, Задзвеі, Ішкалдзі, Лесіна, Падлясейках, Уцёсе поўнасцю страчаны (табл. 1).

*Табліца 1. Характарыстыка паркаў, якія не захаваліся*

| Назва парка | Характарыстыка |
|---|---|
| Гарадзішча | Парк знішчаны падчас забудовы тэрыторыі маёнтка. Зараз на гэтым месцы размяшчаецца дом-інтэрнат. |
| Задзвея | Парк знішчаны пры забудове тэрыторыі маёнтка. Захавалася лядоўня. |
| Ішкалдзь | Парк не захаваўся. |
| Лесіна | Захаваліся асобныя дрэвы. |
| Падлясейкі | Захаваліся асобныя дрэвы. |
| Уцёс | Захаваліся асобныя дрэвы. |

Захаваліся ў выглядзе асобных фрагментаў (у большасці – алеі або асобныя дрэвы) – у Буйнявічах, Жалезніцы, Замош-



Репозиторий БарГУ

шы, Люшнева, Лазоўцы, Старой Мышы, Першамайскім, Паланечцы, Савічах, Сачыўцы, Торчыцах (табл. 2).

Табліца 2. Характарыстыка паркаў, якія захаваліся часткова

| Назва парка | Характарыстыка |
|---|---|
| Буйнявічы (Бурдукоўшчына) | Захавалася алея бэзу. |
| Жалезніца | Захаваліся асобныя дрэвы (напр., таполі белыя). Парк знішчаны падчас нягра-матнай рэканструкцыі тэрыторыі. |
| Замошша | Захаваліся асобныя дрэвы і насаджэнні. |
| Кутаўшчына | Захаваліся асобныя дрэвы і алеі. |
| Люшнева | Захаваліся асобныя дрэвы і алеі. |
| Лазоўцы | Захаваліся асобныя элементы, якія не звязаны паміж сабой. |
| Старая Мыш | Захаваліся асобныя дрэвы і алеі. |
| Першамайскі (Двор Цешаўля) | Захаваліся асобныя дрэвы і насаджэнні. |
| Паланечка | Захаваліся асобныя дрэвы і насаджэнні. |
| Савічы | Захаваліся асобныя дрэвы і насаджэнні. |
| Сачыўка | Захаваліся асобныя дрэвы і алеі. |
| Торчыцы | Захаваліся асобныя дрэвы і алеі. |
| Чэрніхава Ніжняе | Захаваліся асобныя дрэвы і насаджэнні. |

Знішчэнне сядзібнага парка ў весцы Торчыцы адбылося ў 2013–2014 гг. Парк (N 53°23,958', E 26°04,982') знаходзіўся на поўнач ад вёскі і ад дарогі Сталовічы – Вольна (да сярэдзіны XX ст. яе называлі Напалеонаўскі або Нясвіжскі тракт). У 2014 г. дрэвы цэнтральнай часткі парка высечылі, быў знішчаны фундамент магільнага склепа, вынайдзенага ў ходзе даследаванняў 2007–2008 гг. Захаваліся ў заходняй частцы былога парка алея з 13-ці лістоўніц еўрапейскіх (дыяметр дрэваў – 55-65 см), алея з 20 дрэў ліпы сэрцаліставай



Репозиторий БарГУ

(дыяметр ствалоў да 110 см) і ва ўсходняй частцы, якая мяжуе з вузкакалейнай чыгункай, – пасадкі таполі белай. Існаваўшая раней у паўночна-ўсходняй частцы парку сажалка поўнасцю перасохла.

Намі з 1998 г. вядзецца вывучэнне і геаэкалагічны маніторынг паркавых ансамбляў 11 паркаў (табл. 3). Звесткі аб іх стане на 2007 г. апублікаваны [7].

Табліца 3. Характарыстыка захаваных паркаў

| Назва парка | Характарыстыка |
|---|---|
| Вольна | Помнік прыроды мясцовага значэння [11] |
| Дамашэвічы | Не мае ахоўнага статусу |
| Калдычэва | Не мае ахоўнага статусу |
| Крошын | Помнік прыроды мясцовага значэння [11] |
| Паўлінава | Не мае ахоўнага статусу |
| Сваротва | Не мае ахоўнага статусу |
| Стайкі | Не мае ахоўнага статусу |
| Туганавічы | Помнік прыроды мясцовага значэння [11] |
| Верхняе Чэрніхава | Помнік прыроды мясцовага значэння [11] |
| Ясянец | Не мае ахоўнага статусу |
| Ястрамбель | Помнік прыроды мясцовага значэння [11] |

Разгледзім, якая небяспека існуе для захаваных паркаў і вызначым шляхі прадухілення антрапагеннага ціску, магчымасці ашчаднага выкарыстання вышэйназваных паркаў.

*Парк Вольна* (пл. 6,7 га) дзякуючы ахоўнаму статусу поўнасцю захаваў сваю структуру. Дрэвы парку дасягнулі ўзросту спеласці і высокай дэкаратыўнасці. Парк

Рэпазіторый БарДУ

добраўпарадкаваны і актыўна выкарыстоўваецца мясцовымі жыхарамі як рэкрэацыйная зона. Абсталявана зона адпачынку. Парк можа выкарыстоўвацца як турыстычна-экскурсійны аб'ект у межах дазволенага ліміту наведвання.

*Парк Дамашэвічы* (пл. 4,8 га) з'яўляецца паркам пейзажнага тыпу эпохі класіцызму. Да 1939 г. тут меліся сядзібныя пабудовы. Парк знаходзіцца па-за межамі вёскі і таму амаль не падвяргаецца негатыўнаму антрапагеннаму ўздзеянню. Выключэнне – нешматлікія вогнішчы ў берагавой зоне. У парку захаваліся алеі, паляны, і пры ашчадным падыходзе ён можа быць выкарыстаны як аб'ект турызму. Парк у Дамашэвічах у перспектыве можа стаць адной з кропак маршруту, прысвечанага часу знаходжання ў Баранавічах расійскага імператара Мікалая II.

*Парк Калдычэва* (пл. 2,5 га) адносіцца да паркаў рэгулярнага тыпу. Ён знаходзіцца каля паўночнай мяжы аднайменнай вёскі. Сядзіба пасля 1939 г. выкарыстоўвалася як база НКУС, а ў 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі тут лагер смерці. Пабудовы да нашага часу не ацалелі. Дрэвастой у парку захаваўся добра, асабліва шматвекавыя дубы. Парк даглядаецца як частка мемарыяльнага комплексу. Тэрыторыя былога маёнтка выкарыстоўваецца як аб'ект паказу падчас ваенна-гістарычных экскурсій, прысвечаных падзеям вайны 1941–1945 гг.

Пейзажны парк перыяду эклектыкі (пачатак XX ст.) у *Крошыне* (пл. 5 га) мае статус помніка прыроды мясцовага значэння, знаходзіцца ў здавальняючым стане. Першапачатковая структура парка значна зменена. Ёсць забетаніраваныя прагулачныя сцежкі, малыя архітэктурныя формы. Парк добраўпарадкаваны і актыўна выкарыстоўваецца як рэкрэацыйная зона мясцовымі жыхарамі. Абсталявана зона адпачынку.

У парку знаходзіцца дуб, пасаджаны ў 1884 г. паэтам-філаматам А. Адынцом і нацыянальным героем Чылі, нашым земляком І. Дамейкам.

Парк можа выкарыстоўвацца як турыстычна-экскурсійны аб'ект пры ўліку ліміту наведвання.

*Парк Паўлінава* (пл. 7 га) структурна разлучаны.

Репозиторий БарГУ

Папярэднія ўладальнікі тэрыторыі парка распрадалі забудовы некальнім уладальнікам, якія мелі розныя погляды на далейшае бытаванне паркавых элементаў.

У аснове пейзажнай кампазіцыі знаходзяцца вялікая адкрытая паляна і водная сістэма, якая складаецца з сажалкі на р. Качарышка і невялікай трохкутнай сажалкі на ручаі.

Пры правядзенні будаўнічых работ каля сядзібнага кароўніка была высечана тапаліная алея. Практычна поўнасцю захавалася алея, пачатак якой складаюць таполі канадскія, а аснову – ліпы сэрцалісцевыя. Некалькі дрэў ліпы пашкоджаны ветрам. З боку ракі паляну агінае вузкая ліпавая алея, сярод дрэў якой захавалася адна ліпа амерыканская вышынёй 9 м. Уздоўж ручая праходзіць грабавая алея, якая пераходзіць у ліпавую і хваёвую.

Парк знаходзіцца ў дрэнным стане. Паляна зарастае самасевам дробналісцевых парод. Выкарыстоўваецца як рэкрэацыйная зона. Ёсць рэшткі шматлікіх вогнішчаў.

*Парк Сваротва* (пл. 7 га) знаходзіцца ў цэнтры вёскі Вялікая Сваротва, на правым беразе ракі Сваротва. З былой сядзібы Незабытоўскіх, якая існавала да 1939 г., захаваліся рэшткі палаца, лядоўні, канюшні, аранжарэі, тэраса з бэзу і падпорная сценка з бутавага каменю.

Парк характарызуецца вялікай біяразнастайнасцю, але ніякіх захадаў па яго ахове не прадпрымаецца. Наадварот, на парк пастаянна аказваецца ціск з боку селітэбнай забудовы і аб'ектаў сельгаспрадпрыемства. Так, восенню 2014 г. праз тэрыторыю парка была пракладзена дарога для сельгастэхнікі, пры гэтым была часткова разбурана сценка тэрасы.

Лічым неабходным надаць парку статусу помніка прыроды і правесці работы па кансервацыі рэшткаў сядзібных пабудоў.

*Парк Стайкі* (пл. 3 га) знаходзіцца на паўночна-ўсходнім ускрайку вёскі. Дрэўная структура парка захавалася поўнасцю. Адзначаюцца асобныя экземпляры клёна платанападобнага (дыяметр 70 см), ліпы сэрцалісцевай, чатыры буйныя дрэвы арэха манчжурскага, таполі канадскай, ясеня звычайнага.

Для поўнага захавання яго структуры патрэбны пастаянны догляд. У параўнанні з 2007–2008 гг. вакол парка пашырылася зона забудовы, у тым ліку па паўночна-ўсходнім ускрайку, дзе раней вызначаліся панарамныя кропкі на даліну ракі Змейка з сістэмай сажалак.

*Парк Туганавічы* (пл. 11,7 га) – пейзажны парк перыяду рамантызму. Паркавы ансамбль размяшчаецца ў маляўнічай мясцовасці на поўнач ад вёскі Карчова. Усе пабудовы сядзібы былі знішчаны ў 1939 г. Захавалася дрэўная структура парку, аглядныя кропкі. Адзначаецца вялікая біяразнастайнасць, што дазваляе выкарыстоўваць парк як аб'ект экатурызму.

Час ад часу ў парушэнне заканадаўства на тэрыторыі парку з'яўляюцца вогнішчы як вынік рэкрэацыі мясцовых жыхароў.

Цяпер час парк – адзін з аб'ектаў паказу падчас гістарычных экскурсій, прысвечаных Адаму Міцкевічу.

*Парк Верхняе Чэрніхава* (пл. 6,5 га) мае статус помніка прыроды мясцовага значэння. У параўнанні з папярэднімі гадамі істотных змен не адзначана. Выяўлены асобныя выпадкі парушэння структуры паўночнай алеі з ліп. Партэрны ўчастак парку зарастае пустазеллем. Адзіны архітэктурны аб'ект парку, які захаваўся, – вяндлярня – не выкарыстоўваецца. Часткова захаваліся прыдарожная капліца і капліца-пахавальня. Пры ашчадных адносінах парк можа выкарыстоўвацца ў турыстычных мэтах.

*Парк Ясянец* з'яўляецца пейзажным паркам часу класіцызму. Мяркуецца, што парк з'явіўся ў XIX ст., калі маёнткам валодалі Несялоўскія. Сядзіба Ясянец вядома як радзіма апошняга канцлера Вялікага Княства Літоўскага, публіцыста, драматурга Яўхіма Літавора Храптовіча (4.01.1729 – 1812). У Ясянцы прайшло яго маленства.

Плошча парку – 8,5 га. На поўнач і на захад ад яго знаходзяцца сельскагаспадарчыя землі. У ваколіцах парку захаваліся гаспадарчыя пабудовы маёнтка XIX – першай паловы XX стст.

Парк уяўляе цікавасць з пункту гледжання развіцця экалагічнага турызму. Сама даліна ракі Сэрвач, дзе зн-



Рэпазіторый БарДУ

аходзіцца парк, валодае высокай атрактыўнасцю. На ўсход ад парку знаходзяцца геалагічны (гідралагічны) помнік прыроды "Крыніца Ясянец" і вадасховішча Кутаўшчына.

Аснову дрэвастою складаюць дуб чарэшчаты і граб, сустракаюцца клён, асіна, таполя. З поўдня парк абмежаваны тапалінай алеяй. З боку вёскі да парку вядзе алея лістоўніц. Для тэрыторыі парку характэрна высокая біяразнастайнасць. Калі ўлічваць нізкую ступень лясістасці навакolля, то парк Ясянец можна лічыць біяцэнтрам экалагічнай сеткі паўночнай часткі Баранавіцкага раёна.

Асноўнымі фактарамі, якія могуць парушыць стан парку, з'яўляецца складаванне бытавых адыходаў у былым кар'еры, створаным на марэнным схіле ў паўднёвай частцы парку ў 1980–1990 гг. Зараз кар'ер не распрацоўваецца.

Пры ашчадных адносінах парк можа выкарыстоўвацца ў турыстычных мэтах.

*Парк Ястрамбель* (пл.6 га) з'яўляецца помнікам прыроды мясцовага значэння. На тэрыторыі парку знаходзіцца сажалка прамавугольнай формы.

Дрэўныя насаджэнні прадстаўлены ліпай сэрцалісцевай, клёнам платанападобным, бярозай, конскім каштанам звычайным. Тут растуць лістоўніца еўрапейская, сасна веймутава, арэх манчжурскі, дуб чырвоны.

Захаваўся сядзібны дом канца XIX ст., які цяпер выкуплены, рыхтуецца праект яго аднаўлення.

Такім чынам, можна канстатаваць добры стан паркаў, якія маюць ахоўны статус помніка прыроды, а таксама знаходзяцца па-за межамі населеных пунктаў. Неабходна правесці работу па наданні ахоўнага статусу паркам у Дамашэвічах, Сваротве, Ясенцы, а таксама закансерваваць рэшткі сядзібных пабудоў у Верхнім Чэрніхаве, Сваротве. Усе захаваныя паркі могуць выкарыстоўвацца ў турыстычна-экскурсійнай дзейнасці пры ўстанаўленні лімітаў наведванняў.

## Літаратура і крыніцы

1. Антипов, В.Г. Парки Белоруссии / В.Г. Антипов. – Минск. 1975. – 200 с.

Репозиторий БарГУ

2. Памяць: Гістарычна-дакументальная хроніка г. Баранавічы і Баранавіцкага раена. – Мінск: БЕЛТА, 2000. – 736 с.
3. Несцярчук, Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л.М. Несцярчук. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – 336 с.
4. Несцярчук, Л.М. Палацы, паркі, замкі Баранавіцкага раёна: гісторыя, стан, перспектывы / Л.М. Несцярчук. – Брэст: аблдрукарня, 1999. – 80 с.
5. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresah rzeczypospolitej / R. Aftanazy. – T. 2. Wroclaw – Warszawa – Krakow, 1992. – 720 s.
6. Лундышев, Д.С. Орнитофауна старинных парков Барановичского района / Д.С. Лундышев // Актуальные проблемы экологии – 2006: материалы II-й междунар. науч.-практ. конф., Гродно, 22–23 ноября 2006 г. / под общ. ред. проф. Е.П. Кремлева. – Гродно: ГрГУ, 2007. – С.110–114.
7. Рындевич, С. К. Старинные парки Барановичского района: резерваты биоразнообразия и объекты экотуризма : монография / С. К. Рындевич, А. Г. Рындевич, В. Н. Зуев. – Барановичи : РИО БарГУ, 2008. – 239 с.
8. Рындевич, С.К. Старинные парки как резерваты сохранения биоразнообразия в антропогенных ландшафтах / С.К. Рындевич // Экологические проблемы западного региона Беларуси. Сб. науч. статей / Под общ. ред. проф. Е.П. Кремлева. – Гродно: ГрГУ, 2007. – С.101–103.
9. Федорук, А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А.Т. Федорук; ред. Т.Г. Мартыненко. – Минск: БелЭн, 2004. – 576 с.
10. Стратегия развития экотуризма дестинации «Зеленое кольцо Барановичей» / В.Н. Зуев [и др.]; под общ.ред. А.И. Тарасенка. – Брест, 2014 – 48 с.
11. Об объявлении ботанических и гидрологических природных объектов памятниками природы местного значения: решение Барановичского районного исполнительного комитета от 21.12.2010 № 1472 [Электр. ресурс]. – Режим доступа: http://pravo.levonevsky.org/bazaby11/region06/text523.htm – Дата доступа: 02.07.2015.

Репозиторий БарГУ